# Кнігі для сляпых

Па лесніцы, якая вядзе ў бібліятэку імя Леніна, падымаецца сляпы. Ён упэўнена адчыняе дзверы і падыходзіць да бар'ера, дзе сядзіць бібліятэкар.

Інвалід вайны прышоў сюды атрымаць кнігу. Зусім нядаўна бібліятэка пачала атрымліваць абавязковы экземпляр усіх выданняў, якія друкуюцца шрыфтам Брайля для сляпых. За кароткі тэрмін атрымана 500 кніг. Гэта дало магчымасць пачаць рэгулярнае абслугоўванне сляпых, якія жывуць не толькі ў Мінску, але і на перыферыі.

За апошні час савецкія выдавецтвы, у прыватнасці маскоўскі «Учпедгиз», выпусцілі для сляпых многа навінак савецкай мастацкай і палітычнай літаратуры. Сляпыя могуць павышаць свой ідэйны ўзровень, атрымліваць асвету.

Пасылкі з кнігамі-навінкамі, якія прыходзяць у адрас бібліятэкі, вялікія па аб'ёму; яны набраны шрыфтам Брайля, які сляпыя чытаюць пры дапамозе пальцаў. Раман Л. Н. Талстога «Вайна і мір» складаецца з 28 кніг, раман А. Фадзеева «Маладая гвардыя»—з 10, «Дыялектыка прыроды» Ф. Энгельса — з 8 кніг.

З першых дзён заснавання фонду літаратуры для сляпых кнігі з Мінска пачалі атрымліваць праз міжбібліятэчны абанемент сляпыя—інваліды вайны, якія жывуць у раёнах.

Беларускае таварыства сляпых пачало ствараць невялікія ўласныя бібліятэкі ў тых гарадах, дзе існуюць навучальна-вытворчыя прадпрыемствы сляпых. Бібліятэчкі пры 8 прадпрыемствах у Барысаве, Навагрудку, Гродна, Гомелі таксама атрымліваюць навінкі літаратуры, якія выдаюцца шрыфтам Брайля.